УДК 947.6 «17»

І.М. Рыжанкоў, аспірант

# УЗДЗЕЯННЕ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ ПАДЗЕЙ НА НАСТРОІ І ПАВОДЗІНЫ СЯЛЯНСТВА БЕЛАРУСІ НАПАЧАТКУ ВЯСНЫ 1917 Г.

In clause the revolution developments impact of the peasantry and their behavior during the spring of 1917 are described.

Да гарадскога насельніцтва неакупаванай Беларусі звесткі аб рэвалюцыйных падзеях у Петраградзе трапілі з мясцовых і сталічных газет [1]. Зразумела, што газеты не маглі стаць адзінай крыніцай інфармавання ўсяго насельніцтва. Абвяшчэнне насельніцтва вёсак, мястэчак, а таксама гарадоў, аддаленых ад чыгунак, пазбаўленых газет і сродкаў камунікацыі, часцей адбывалася пасля ўсталявання новай улады ў буйнейшых гарадах Беларусі. У некаторых месцах паралельна з заснаваннем інстытута губернскіх і павятовых камісараў, грамадска-дзяржаўных камісарыятаў намаганнямі работнікаў земскіх устаноў, паліцыі, элементаў вясковай інтэлігенцыі і святароў былі арганізаваны сельскія сходы, набажэнствы, на якіх абвяшчаўся змест маніфестаў і ўрадавых загадаў, пастаноў, адозваў і інш. У большасці выпадкаў праведзеныя мерапрыемствы, прысвечаныя азнаямленню вясковых жыхароў з урадавамі праграмамі, былі накіраваны на прадухіленне магчымых беспарадкаў, падтрымку стабільнасці на месцах.

На этапе, калі стары лад перастаў існаваць, а новы толькі ўсталёўваўся, сяляне да актыўных дзеянняў не заклікаліся. У дадзеным выпадку ад іх патрабавалася толькі выкананне ранейшых абавязкаў, незалежна ад перамен. Як вынікала са зместу Маніфестаў аб адрачэнні Мікалая II і адмове ад трона Міхаіла Аляксандравіча, пытанне аб лёсе манархіі заставалася адкрытым да канчатковага вырашэння яго Устаноўчым сходам. Да таго ж новы кабінет міністраў, названы Часовым урадам, набываў легітымную ўладу з рук былога цара. Можна меркаваць, што ў сваёй працы па тлумачэнні сутнасці падзей агітатары і службовыя асобы акцэнтавалі ўвагу на законнасці ладу, які ўсталяваўся ў імперыі, і на агульным абавязку падтрымліваць яго. Аб тым, што праява законапаслухмянасці ў настроях і паводзінах сялян была вызначальнай на сакавіцкім этапе развіцця рэвалюцыі, сведчаць не рэдкія выпадкі захопаў панскай маёмасці, а шматлікія пастановы валасных сходаў аб ахвяраванні сродкаў на карысць дзеючай арміі, падтрыманне парадку і распачаты неўзабаве ўдзел у рэарганізацыі органаў самакіравання [2, арк. 61, 72].

З тых падзей, якія былі даведзены сялянству, найбольшую ўвагу і свайго кшталту псіхалагічны шок выклікаў факт адрачэння Мікалая II ад трона. Пра пануючы ў сялянскай калектыўнай свядомасці «ашаламлённы стан» гаварыў земскі дзеяч Гарадоцкага павета В. Карпаў. Характэрна, што, пачуўшы аб скасаванні манархіі, сяляне выказвалі заклапочанасць: «А ці не будзе горш без цара?». У той самы час ураджанні ад набажэнства ў царкве з нагоды новага ладу былі «вельмі добрыя, сяляне аднесліся са спачуваннем» [3, арк. 41]. Падобныя настроі былі ўласцівыя вяскоўцам сумежнага з Магілёўскай губерняй Сычоўскага павета. Паводле слоў селяніна А. Котава, «народ быў ашаламлёны весткай аб адрачэнні… было нешта страшэннае, жудаснае, такім немагчымым здавалася гэтае паведамленне» [4, с. 103].

Вядомы асобныя факты процілеглага стаўлення сялян да адрачэння царскай асобы. У вёсцы Новае Полацкага павета на сялянскім сходзе з нагоды абвяшчэння названага Маніфеста «святочны настрой» дапоўніўся наступнымі водгукамі: «Так і трэба. Даўно пара!» Паводле звестак газеты «Речь», «пасля праведзеных сялянамі арыштаў стражнікаў,ураднікаў было вырашана адправіць грамадскі наказ у Петраград хадаком да вядомага ў сялянскім асяроддзі Мілюкова» [5].

Перыяд «міжуладдзя» аб'ектыўна спрыяў дэкласіраваным элементам, найперш тым, хто імкнуўся да задавальнення асабістых, карыслівых выгод. Было б памылкова шукаць у

іх учынках, як гэта рабілася калісьці, палітычныя матывы. У большасці тэлеграм на гэты конт паведамленні аб выпадках лясных парубак, выкрадання хлеба і іншай маёмасці з маёнткаў прыватных уладальнікаў. Так, у Рагачоўскім павеце (14 сакавіка) «сяляне разрабавалі і спалілі маёнтак, секлі казённы і памешчыцкі лес». На Міншчыне ўзброеныя дэзерціры з мясцовых сялян захапілі маёнтак «Забалоцце» [6, с. 5]. Дзякуючы намаганням мясцовых улад, беспарадкі былі перапынены. У параўнанні з цэнтральнымі губернямі Расіі, аграрны рух на Беларусі не быў тыповай з'явай, ён разгортваўся са значным спазненнем, ахапіў у сакавіку толькі 5 з 49 паветаў [4, с. 103]. Безумоўна, што факты захопаў чужой маёмасці, арыштаў памешчыкаў, па сутнасці, былі выпадковымі і адзінкавымі.

Напэўна, гвалтоўныя крокі вяскоўцаў супраць чужой уласнасці былі выкліканы іх уяўленнямі аб магчымым вяртанні старога ладу. Натуральна, што некаторыя з іх у мэтах паляпшэння свайго эканамічнага становішча вырашалі скарыстаць момант паслаблення дзяржаўнай улады. У любым выпадку, захопы чужой маёмасці сялянамі, нярэдка з удзелам салдат, былі выкліканы не «рэвалюцыйнымі настроямі», а паслабленнем улады. Ёсць падставы меркаваць, што ўжо ў сакавіку пад уздзеяннем рознага кшталту агітацыйных сродкаў сяляне набылі цвёрдае перакананне ў вырашэнні іх праблем Устаноўчым сходам, неабходнасці падтрымліваць спакой і парадак. Разам з адзінымі гвалтоўнымі акцыямі некаторыя вяскоўцы выказвалі памкненні да павелічэння сваёй зямельнай маёмасці законным шляхам яшчэ да Устаноўчага сходу. У прыватнасці, як паведамляў жыхар вёскі Рудабелка Бабруйскага павета А. К. Макавецкі, «першай справай сяляне пажадалі набыць зямлю ў памешчыка добраахвотна, для чаго некаторыя прадалі свае апошнія манаткі» [4, с. 90].

У красавіку сіламі ўрадавых структур, мясцовай дэмакратыі, эмісараў ПС-Р, земскіх начальнікаў, «гарадскіх настаўнікаў, салдат, семінарыстаў» сяляне сустрэлі перамогу Лютаўскай рэвалюцыі мітынгамі і шэсцямі, царкоўнымі малебнамі, паніхідамі па барацьбітах за свабоду, святамі «народнай свабоды», дабрачыннымі акцыямі, валаснымі сходамі «для правядзення выбараў службовых асоб часовага самакіравання» [2, арк. 14], прывітаннямі Часоваму ўраду, з лозунгамі і сцягамі «Няхай жыве вольная Расія», «Няхай жыве рэвалюцыйная армія», «Няхай жыве дэмакратычная Расія» [7, арк. 77; 8].

Такім чынам адбываўся складаны працэс абжывання новай і нязвыклай для сялян палітычнай рэчаіснасці. Можна меркаваць, што рэакцыя вясковага насельніцтва Беларусі на весткі аб усталяванні ў краіне новага ладу адпавядала ўрадавым чаканням. Намаганнямі ўладных структур, грамадскіх арганізацый і органаў самакіравання сялянства выказала прыхільнасць Часоваму ўраду, пацвердзіла гатоўнасць узмацніць дапамагу фронту, абяцала захоўваць спакой і парадак і г. д.

Але праведзеныя на вёсцы мерапрыемствы не здолелі прынцыпова закрануць архетыпы сялянскай ментальнасці. На пачатку мая падчас арганізацыі рознага кшталту камітэтаў па справах вёскі, павятовых і губернскіх сялянскіх з'ездаў у свядомасці вяскоўцаў яшчэ прысутнічалі спачуванні да звергнутага царызму, «пакутніка цара», некаторыя чакалі «набліжэння царства антыхрыста». Як паведамлялася ў газетнай нататцы «Голас з вёскі», у настроях беднаты адчувалася сумненне адносна дэмакратычнасці рэжыму: «раўнапраўе – глеба для небяспекі, зацісну́ць, маўляў, мужыкі-багацеі ды «жыды»; пытанне аб жаночым раўнапраўі выклікае толькі ўсмешку» [9].

На працягу гісторыі свайго фарміравання светапогляд сялянства падсілкоўваўся лакальнымі ведамі навакольнага свету і своеасаблівымі формамі яго тлумачэння. Кожная з'ява, якая мела чужынскае паходжанне, адчувала сутыкненне з мясцовай практыкай жыцця. З надыходам рэвалюцыі межы сялянскага свету пашырыліся, выходзячы за рамкі «вясковага ладу», а старых ведаў для тлумачэння рэчаіснасці стала не хапаць. Відавочна таму сялянства адносна працяглы час прызвычайвалася да новай сацыяльна-палітычнай сістэмы. Перажытыя пачуцці разгубленасці, немагчымасць растлумачыць сэнс сталічных падзей, «жах» перад маштабамі і памерамі палітычных зрухаў былі абумоўлены не столькі

ўрывачным характарам інфармацыі, колькі спрадвечнымі ідэйна-псіхалагічнымі сялянскімі ўстаноўкамі, якія выяўляліся ў шанаванні старой мадэлі свету і насцярожаным успрыманні новай.

ЛІТАРАТУРА


1. Минский голос. 1917. 4 марта.
2. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 1778. В. 1. С. 143.
3. Нацыяльны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 626. В. 1. С. 1.
4. 1917 г. в деревне. (Воспоминания крестьян) / Редактор Я.Л. Яковлев. М., 1967.
5. Речь. 1917. 15 марта.
6. Крестьянское движение в 1917 г. / Под ред. М.Н. Покровского, Я.А. Яковлева. М., 1927.
7. НАРБ. Ф. 60. В. 3. С. 242.
8. Вестник Минского губернского комиссариата. 1917. 12 апреля.
9. Гомельская копейка. 1917. 6 мая.